УДК 821.161.09(092)

*А. У. ЯРМОЛЕНКА*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту, г. Гомель

# АСЭНСАВАННЕ ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛЬНЫХ ПЫТАННЯЎ У ТВОРЧАСЦІ І. НАВУМЕНКІ

Знакавай з’явай для беларускага грамадства ў XX стагоддзі з’яўляецца чыгунка. У беларускай літаратуры адлюстраваны асноўныя этапы развіцця чыгуначнай магістралі, звязаныя з важнейшымі падзеямі эпохі. Паскоранае будаўніцтва чыгункі і яе актыўная эксплуатацыя ў XX стагоддзі знаходзяць сваё асэнсаванне у мастацкіх творах. Вобраз чыгункі сімвалізуе новыя перспектывы, якія адкрывае для беларускага грамадства тэхніка, машыны і звязаныя з імі новыя прафесіі. У перыяд актыўнага развіцця і эксплуатацыі прагрэсіўнага тыпу камунікацыі мастакі слова засяроджваюць увагу на сацыяльных, псіхалагічных і маральных зменах, якія характарызуюць эпоху тэхнічнага прагрэсу.

Асаблівае значэнне набывае чыгунка ў час вайны. На працягу Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны чыгуначны шлях служыць асноўным сродкам камунікацыі для перамяшчэння вайсковых фарміраванняў: людзей і тэхнікі. Надзвычай важная роля транспартнага шляху, яе уплыў на вырашэнне экзістэнцыяльных пытанняў: сэнсу жыцця, смерці, маральнага выбару чалавека ў пагранічнай сітуацыі − адлюстраваны ў творах беларускіх пісьменнікаў-франтавікоў: М. Гарэцкага, І. Шамякіна, В. Быкава, І. Навуменкі.

Аснову творчасці пісьменніка Гомельшчыны І. Навуменкі складаюць трагічныя падзеі 1941–1945 гадоў. Яго біяграфія непасрэдна звязана з Вялікай Айчыннай вайной, тэме якой ён прысвяціў большасць сваіх апавяданняў, аповесцей і раманаў. Вайна ўварвалася ў яго жыццё у самым раннім узросце. Па сведчанню даследчыкаў, Навуменка актыўна ўключыўся ў барацьбу з нямецкімі захопнікамі: “З прыходам фашыстаў у родныя Васілевічы [Навуменка] стаў адным з арганізатараў падпольнай маладзежна-камсамольскай арганізацыі, якая пазней была названа “За радзіму”. Яго сябры і аднадумцы вывешвалі адозвы, збіралі разведвальныя звесткі для партызанаў, як маглі, шкодзілі фашыстам. Неўзабаве была наладжана сувязь з армейскай дыверсійнай групай, якая кіравала дзейнасцю маладзёжнай падпольнай групы” [1, с. 341].

Такім чынам, філасофскаму асэнсаванню пытанняў быцця чалавека, існавання асобы ў пагранічнай сітуацыі садзейнічаў непасрэдны вопыт І. Навуменкі. Перажытыя з’явы, асабістыя думкі, пачуцці і перажыванні ляглі ў аснову масштабнага апісання падзей Вялікай Айчыннай вайны ў рамане «Сорак трэці» (1970−1973). Адлюстраванне лёсу аднаго з герояў непасрэдна звязана з развіццем чыгункі на тэрыторыі Беларусі. На прыкладзе біяграфіі Лубана пісьменнік аналізуе экзістэнцыяльныя праблемы жыцця і смерці, сэнсу існавання і прызначэння чалавека.

З самага пачатку дзеяння рамана празаік выразна акрэслівае ўплыў працы на магістралі на развіццё маральных якасцей героя. Дзякуючы чыгунцы чалавек знаходзіць сваё прызначэнне ў жыцці. Праца чыгуначніка пазбаўляе яго ад удзелу ў незаконнай дзейнасці, натхняе на стваральную работу, дае адчуванне годнасці і прыналежнасці да вялікіх здзяйсненняў. “Школа памочнікаў машыністаў, куды сілком зацягнуў трох сяброў-прыяцеляў Саша Грыгоніс, была пачаткам яго, Лубанавага, узлёту. Ён добра вучыўся і, нібы азірнуўшыся на марна растрачаныя гады, усю душу аддаваў заняткам, паравозу, кнізе, якая нечакана адкрыла для яго новы прывабны свет. Ён любіў тэхніку, забыўшы на ўсё, мог днямі, начамі праседжваць над схемамі, разгадваць іх сэнс, да самага складанага даходзіць уласным розумам” [2, с. 13].

Пісьменнік дэталёва характарызуе ўдасканаленне асобы, пашырэнне яе кругагляду, адаптацыю да новага становішча. Аўтар апісвае як натхненне ад прагрэсу, прыналежнасці да карэнных змен, дае магчымасць уплываць на свой лёс, рэалізаваць інтэлектуальныя і маральныя магчымасці асобы. З дапамогай прафесійнай адукацыі герой выходзіць на шлях развіцця, набывае запатрабаваную спецыяльнасць у новай галіне народнай гаспадаркі. Яго акрыляе работа, знаёмства і ўкараненне новых тэхнічных распрацовак. Аўтар паказвае, як прафесійная дзейнасць становіцца сэнсам жыцця, стымулам для духоўнага росту чалавека.

«*Ён ездзіў памочнікам машыніста, затым, як і бацька, машыністам, быў ужо жанаты, калі надарылася магчымасць вучыцца ў філіяле тэхні-кума, і ён нават з нейкім захапленнем, адрываючы час ад сну, адпачынку, закончыў тэхнікум, адразу паступіўшы на завочнае аддзяленне чыгуначнага інстытута. То быў час, калі чыгунка адмаўлялася ад старасветчыны, мя-няла твар, воблік, дамагаючыся тэхнічнага прагрэсу ва ўсіх галінах сваёй гаспадаркі. З паравоза ён злез тады, калі нават невялікія палявыя станцыі пераходзілі на аўтаблакіроўку, аўтаматычную сцэпку вагонаў, калі паяві-ліся першыя цеплавозы і электравозы. Новае ўсюды перамагала. Ён і зай-маўся гэтым новым – укараняў аўтаблакіроўку, – па тыднях не бываў дома, адчуваючы, што жыве недарэмна, прыносіць карысць. Ён ведаў, любіў сваю работу*» [2, с. 13].

Такім чынам, чыгунка у рамане І. Навуменкі становіцца сімвалам удасканалення асобы. Будаўніцтва і эксплуатацыя шляхоў зносін адыгрываюць вырашальную ролю ў эвалюцыі маральных якасцей героя і яго паплечнікаў. Чыгунка сімвалізуе жыццёвы шлях, надзею на лепшае будучае, выпрацоўку станоўчай мадэлі паводзін беларускага грамадства ў цэлым і індывіда ў прыватнасці. Па сутнасці, чыгунка ўплывае на станаўленне аксіялагічнай сістэмы чалавека працы, які ганарыцца сваёй прафесіяй і прысвячае большую частку свайго жыцця выкананню службовых абавязкаў.

Кардынальныя змены ў фарміраванне асобы героя ўносяць перадваенныя і ваенныя падзеі на тэрыторыі Беларусі. На Лубана пішуць несправядлівы данос. Яго выклікаюць на допыты, але да суда справа не даходзіць. У той жа час у героя нараджаюцца першыя праявы расчаравання, незадавальнення, жадання кардынальна змяніць свой лёс.

І. Навуменка адлюстроўвае характар Лубана ў развіцці, у дынаміцы. Працягваючы традыцыі М. Гарэцкага, ён апісвае пачуцці і перажыванні, рэфлексію героя, якая прыводзіць яго на заганны шлях здрады радзіме. У час акупацыі Лубан становіцца намеснікам бургамістра. З адданага сваёй працы і бацькаўшчыне чыгуначніка ён ператвараецца ў здрадніка, прыслужніка фашыстаў. Але сумленне не дае герою спаць па начах. Пісьменнік адлюстроўвае крызіс асобы, расчараванне героя і незадавальненне самім сабой. «*Лубан не спіць. Гэта не першая ноч, калі ўладным чорным крылом яго ахінае бяссонніца. Перабіраючы па малюткай дробязі сваё жыццё, ён стараецца знайсці той паварот, перакос, з якога пачаў завязвацца цяперашні чортаў вузел. Вінаваціць аднаго сябе. Быў залішне ганарысты, гарачы, глядзець у корань не ўмеў*» [2, с. 14].

Аўтар характарызуе разуменне фатальнай памылкі, зробленай героем. Навуменка аналізуе думкі і пачуцці пратаганіста, адлюстроўвае, як у пагранічнай сітуацыі змяняюцца погляды Лубана, адбываецца пераацэнка маральных каштоўнасцей. Нягледзячы на няўстойлівы характар і зменлівыя падзеі эпохі, герой у рэшце рэшт не здраджвае сабе і свайму народу. З рызыкай для свайго жыцця і жыцця сваёй сям'і ён далучаецца да партызан. Прайшоўшы выпрабаванні, ён гатовы служыць сваёй радзіме, уласнай крывею адплаціць за здраду.

Вайна не шкадуе сям'ю Лубана. Фашысты расстрэльваюць яго жонку і дзяцей. Аўтар адлюстроўвае вострае пачуццё страты і віны, асэнсаванне сваёй памылкі і пакаянне героя: «*Пажар у душы штодня. Сэрца баліць вострым, адчувальным болем – нібы загналі туды жалезны цвік. У галаве засела адно: ён, Лубан, вінаваты ў смерці дзяцей і жонкі. Свет цёмны, змрочны. Адчай, які агортвае душу, мяжуе з вар'яцтвам. Неўтаймаваны боль Лубан носіць у сабе пастаянна, не могучы ад яго пазбавіцца ні днём, ні ноччу. Адпачынак прыходзіць у сне. У сне Лубан бачыць дзяцей, жонку жывымі. У вачах жонкі – дакор. Старэйшы сын, якому споўнілася чатырнаццаць, апрануты ў выцвілую кашульку, нешта майструе*» [2, с. 174].

Утаймаваць боль і горыч, пазбавіцца ад мук сумлення дапамагае толькі актыўная дзейнасць. Аўтар зноў вяртае свайго героя на чыгунку. Пасля захопу фашыстамі галоўная магістраль служыць шляхам дастаўкі зброі і салдат-карнікаў, якія знішчаюць усё жывое на сваім шляху. Вопыт чыгуначніка дапамагае Лубану стаць актыўным удзельнікам рэйкавай вайны, аказваць супраціўленне ворагу і ратаваць жыццё сваіх суайчыннікаў. Выкарыстоўваючы свае прафесійныя навыкі ён падрывае чыгуначнае палатно, пускае пад адхон нямецкія саставы:

«*Жыццём Лубан не даражыць, смерці не баіцца. Федзеву навуку – як падыходзіць да чыгункі, закладваць, маскіраваць міну − пераняў з першага разу. Другі эшалон – цягнік і дванаццаць цяжкіх пульманаўскіх вагонаў – ён скінуў сам. Ці яму, чыгуначнаму інжынеру, доўга трэба вучыцца, дзе і як выбіраць месца дыверсіі, ладкаваць зарад, выбіраць патрэбны момант?*

*Потым было руйнаванне чыгункі ля Хлудоў, падрыў яшчэ некалькіх эшалонаў, якія Лубан – цяпер ужо камандзір падрыўнікоў Бацькавіцкага атрада – правёў з бляскам, з адчайнай рашучасцю. І пацяплелі, бачачы бясстрашша, хмельную адвагу былога намесніка бургамістра, партызанскія сэрцы, зніклі хмурыя, насцярожаныя позіркі. Толькі, мабыць, ніхто не ведае, што хвіліны, калі Лубан ляжыць у зарасніку, трымаючы ў руках працягнуты ад узрывальніка шнур, ці кулём ляціць у адхон, паставіўшы націскны ўзрывальнік на віду ў эшалона, з'яўляюцца якраз тым збавеннем, калі яго часова пакідаюць пякучыя, адчайныя думкі»* [2, с. 175].

Пісьменнік апавядае, як паступова падрыўнаўная дзейнасць на чыгуначнай лініі аднаўляе годнасць героя. Прафесійныя навыкі дапамагаюць у яго дзейнсці, са здрдніка і адшчапенца ён зноў ператвараецца ў асобу. Далучэнне да вялікай справы змагання з фашыстамі становіцца сімвалам трансфармацыі чалавека, якое спрыяе аднаўленню сістэмы маральных прынцыпаў. Праца на карысць Радзіме, абарона свайго народа ад смяротнай небяспекі дапамагае герою знайсці свой шлях у пошуках сэнсу жыцця. Пісьменнік адлюстроўвае маральны выбар героя ў пагранічнай сітуацыі, калі пад пагрозай смерці ён вымушаны пераасэнсаваць сваё жыццё, даць адказ на экзістэнцыяльныя пытанні.

Такім чынам, у творчасці І. Навуменкі адлюстраваны лёс чалавека ў крызіснай сітуацыі. Пры асэнсаванні экзістэнцыяльных пытанняў пісьменнік, біяграфія якога непасрэдна звязана з Вялікай Айчыннай вайной, паказвае час і абставіны, якія ўплываюць на выбар чалавека ў момант смяротнай небяспекі. У рамане «Сорак трэці» аўтар апісвае станаўленне і развіццё характару асобы, супярэчлівасць натуры, здольнай да граху і пакаяння, забойства і самаахвярнасці.

Пры асвятленні вобраза героя, яго жыццёвых калізій, важную ролю ў рамане адыгрывае чыгунка. Існаванне персажа непарыўна звязана з развіццём чыгуначнай гаспадаркі на тэрыторыі Беларусі, з падзеямі «рэйкавай вайны» ў час фашысцкай акупацыі краіны. Чыгунка служыць сімвалам жыццёвага шляху, надзеі на лепшае будучае індывіда. Па сутнасці, чыгунка адыгрывае вырашальную ролю ў станаўленні аксіялагічнай мадэлі паводзін чалавека працы, які ганарыцца сваёй прафесіяй і прысвячае большую частку свайго жыцця выкананню службовых абавязкаў.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1 Война в славянской литературе / сост. И. Н. Афанасьев. – Мозырь : Белый Ветер, 2006. – 402 с.

2 *Навуменка, І. Я.* Збор твораў. У 10 т. / І. Я. Навуменка. – Мінск : Маст. літ., 2015. − Т. 6. : Сорак трэці. Смутак белых начэй : раманы. – 797 с.